ропейской школ. Наличие единых принципов и последователей во многом определили пути дальнейшего развития цимбального исполнительского искусства.


1. *Жинович, И. И.* Школа для белорусских цимбал / И. И. Жинович. – М. : Гос. Изд-во БССР. Ред. муз. лит., 1948. – 161 с.

2. Жыновіч ва ўспамінах сучаснікаў : зб. арт. / М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. акад. музыкі ; склад. М. Р. Солапаў. – Мінск : Беларус. дзярж. акад. музыкі, 1997. – 56 с. : іл.

3. *Насценка, З. Н.* Іосіф Жыновіч: старонкі жыцця / З. Н. Насценка. – Мінск : Беларусь, 1969. – 44 с.



УДК 37.017.4-79(476) (075)



***К. І. Шык,***
*выкладчык кафедры рэжысуры ўстановы адукацыі*
*«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*


## ПАТРЫЯТЫЧНАЕ ВЫХАВАННЕ СТУДЭНТАЎ У ПРАЦЭСЕ ВЫКЛАДАННЯ ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ «ТЭХНАЛОГІЯ СТВАРЭННЯ СВЯТА»


У сучасным соцыуме існуе неабходнасць выкарыстання патэнцыялу святочнай дзейнасці ў фарміраванні патрыятызму студэнтаў. Акцэнт зроблены на негвалтоўным выхаванні студэнтаў у працэсе выкладання дысцыпліны «Тэхналогія стварэння свята» праз формы святочнай дзейнасці культурна-пазнавальнай накіраванасці, такія як святы і канцэрты, шоу-праграмы і літаратурныя вечары, спартыўныя відовішчы і гульнёвыя забавы, прыярытэтнай мэтай якіх з'яўляецца азнаямленне з гісторыяй і культурай Беларусі і якія могуць выступаць эфектыўным інструментам у працэсе патрыятычнага выхавання.



**Ключавыя словы:** святочная дзейнасць, патрыятызм, патрыятычнае выхаванне, студэнты, негвалтоўнасць, методыка, тэхналогія стварэння свят.



***K. Shyk,***
*Lecturer of the Department of Directing*
*of the Educational Institution*
*"The Belarusian State University of Culture and Arts"*


## PATRIOTIC EDUCATION OF STUDENTS IN THE PROCESS OF TEACHING THE DISCIPLINE "TECHNOLOGY OF CREATING HOLIDAYS"

**Abstract.** In today's society there is a need for the opporunities that holiday activities provide in the field of patriotic education of students. The article highlights the method of non-violent forms of parenting through festive activities of cultural and cognitive orientation, such as festivals and concerts, shows and literary evenings, sporting events and active outdoors games; the main aim of which is to introduce the history and culture of the Motherland. This can be an effective technique in patriotic education.

**Keywords:** festive activities, patriotism, patriotic education, students, non-violent forms of parenting, technique, тechnology of creating festivals.

Вучэбная дысцыпліна «Тэхналогія стварэння свята» [1] прадугледжвае выкладанне розных аспектаў увасаблення свята з улікам тэарэтычных дасягненняў айчыннай і замежнай рэжысуры, фарміруе ў студэнтаў глыбокія веды і практычныя навыкі па вырашэнні тэхналагічных праблем увасаблення святочных дзей. Неабходна падкрэсліць, што засваенне тэм праграмы адпавядае сённяшнім патрабаванням вывучэння дысцыпліны ў кантэксце арганізацыі свят і канцэпцыі патрыятычнага выхавання моладзі.

У лагічнай паслядоўнасці падчас выкладання дысцыпліны раскрываецца сутнасць і змест практычных і індывідуальных заняткаў у творчым і арганізацыйным увасабленні масава-гульнявых, абрадава-рытуальных, мастацка-відовішчных, спартыўных і культурна-бытавых дзей для прадстаўнікоў розных тыпалагічных груп насельніцтва. Вывучэнне традыцыйных абрадаў, свят народнага календара, спартыўных і іншых сучасных святочных формаўтварэнняў, тэатралізаваных прадстаўленняў, канцэртаў, літаратурна-музычных кампазіцый абуджае патрыятычныя пачуцці студэнтаў, павышае ўзровень іх тэарэтычных і практычных ведаў аб родным краі, вучыць шанаваць прыроду і захоўваць гісторыка-культурную спадчыну.

У працэсе патрыятычнага выхавання падчас выкладання дысцыпліны спалучаецца кіруючая роля выкладчыка з усебаковым развіццём асобы, яе актыўнасцю і самастойнасцю, звязваючы святы з самавыхаваннем. Самавыхаванне – гэта свядомая і несвядомая дзейнасць чалавека, якая вызначаецца вядучымі асабістымі меркаваннямі, якія ўзнікаюць у працэсе сацыялізацыі і выхавання, накіраваная на ўдасканаленне сябе як асобы, што забяспечвае чалавеку пазіцыю суб’екта сацыялізацыі [2, с. 198].

Кожны занятак па дысцыпліне «Тэхналогія стварэння свята» ўключае падрыхтоўчы, арганізацыйны, асноўны і заключны этапы.

На падрыхтоўчым этапе аналізуецца свята, вызначаецца яго актуальнасць, тэма, ідэя, задачы і звышзадача.

На арганізацыйным этапе вызначаюцца яго структура: рэжысёрска-пастановачная група, склад аргкамітэта, матэрыяльна-тэхнічнае і арганізацыйнае забеспячэнне, аналізуецца ці распрацоўваецца сцэнарый.

На асноўным этапе адбываецца распрацоўка рэкламнай прадукцыі свята, перадсвяточнай атмасферы, мерапрыемстваў вытворчай і мастацкай накіраванасці, праводзіцца работа над архітэктурна-дэкаратыўным афармленнем свята, прызавым фондзе і магчымым увасабленнем святочнага дзеяння.

На заключным этапе падводзяцца вынікі і адбываецца рэфлексія.

У сваю чаргу студэнты падчас індывідуальных заняткаў знаёмяцца з гісторыяй пэўнага свята, ствараюць сцэнарый, які ўключае загадзя адабраны літаратурны і музычны матэрыял, распрацоўваець службовую дакументацыю падрыхтоўкі і правядзення свята згодна з патрабаваннямі заканадаўства Рэспублікі Беларусь. Арганізоўваюць рэпетыцыі, вядуць працу па начытванні літаратурнага сцэнарыя, вывучэнні песень, пастаноўцы танцаў, мадэлююць афармленне залы, вулічных пляцовак, паркаў і г. д., вырабляюць аксэсуары да касцюмаў. Вучацца ўдасканальваць сцэнарый: уносяць змены і карэктывы, якія ўзнікалі падчас працы.

Рэфлексійна-ацэначны этап – гэта выніковы этап, на якім студэнты вучацца рэфлексаваць (аналізаваць) уласную дзейнасць, ацэньваць яе, супастаўляючы вынікі дзейнасці з пастаўленымі асноўнымі і прыватнымі задачамі (мэтамі). На практычных занятках праводзяцца тэматычныя гутаркі, круглыя сталы, у якіх студэнты могуць выказаць свае прапановы і заўвагі, вылучыць найбольш важнае і галоўнае ў свяце, патлумачыць цікавыя і незразумелыя моманты. На гэтым этапе замацоўваюцца найбольш змястоўныя і маляўнічыя ўражанні, звязаныя з тэматыкай свята, якія захоўваюцца ў памяці, фатаграфіях, відэазапісах і г. д. Працу па падвядзенні вынікаў распрацаванага свята неабходна арганізаваць так, каб студэнты

маглі атрымаць пачуццё эмацыянальнага задавальнення, радасць перамогі, шчасце пазнання новага, цікавага. Тым самым будзе фарміравацца арыентацыя на перажыванні такіх пачуццяў у будучыні, што прывядзе да патрэбнасці ў творчасці, пазнанні, ва ўпартай самастойнай рабоце, г. зн. да з'яўлення станоўчай устойлівай матывацыі да патрыятычных праяў, пра якія студэнты могуць нават не здагадвацца. Галоўная задача выкладчыка – не звяртаць увагу студэнтаў на тое, што ідзе пэўны педагагічны працэс, а зразумець ускоснымі метадамі, ці абагаціліся яны якасцямі, уласцівымі для патрыётаў. Мэтазгодна выкарыстоўваць разнастайныя метады і прыёмы, якія даюць магчымасць праявіць студэнтам самастойнасць і ініцыятыву.

Напрыклад, можна даць наступныя заданні: скласці схему (мадэль) свята, на якім яны прысутнічалі, у якой форме выявіліся асноўныя паняцці, ідэі, закладзеныя ў свяце, і сувязі паміж імі (хатняе заданне могуць выконваць групы па 3–5 чалавек).

Пералічыць пытанні і задачы, па якіх можна праверыць узровень засваення ведаў. Падвядзенне вынікаў можна правесці ў выглядзе адкрытага дыялогу, на якім некаторыя студэнты выступяць у якасці экспертаў з аглянымі дакладамі па асобных аспектах свята з наступным калектыўным абмеркаваннем гэтых дакладаў.

Для выхавання ўменняў ацэньваць сваю працу, дарэчы даць заданне:

а) пералічыце асноўныя пытанні, закранутыя на вашым свяце, і пазначце побач, для чаго вамі былі ўзняты гэтыя пытанні;

б) пералічыце ўменні, якія вы набылі падчас заняткаў па дысцыпліне, і пакажыце, як вы асвоілі кожнае з іх: добра, слаба, не засвоілі.

Далей праводзіцца абмеркаванне студэнцкіх распрацовак свят з мэтай выпрацоўкі адэкватнай самаацэнкі святочнай дзейнасці, для высвятлення прычын недахопаў і дзеянняў, якія варта выканаць, каб дапрацаваць свята. Важна, каб кантроль і ацэнка выкарыстоўваліся для заахвочвання і далейшага ўдзелу ў святочнай дзейнасці, стварэння перспектыў для фарміравання патрыятычных праяў.

Заняткі павінны ісці ў адпаведнасці з тэматычным планам, які сфарміраваны так, каб падцягнуць свае веды па гісторыі і

мове, мастацкай культуры, праявіць свае фізічныя здольнасці, атрымаць дадатковыя веды па рэжысуры і ацаніць той факт, што яны нарадзіліся, жывуць і будуць працаваць менавіта ў Беларусі.

Ніжэй прыведзены рэкамендацыі, якія варта ўлічыць выкладчыку дысцыпліны «Тэхналогія стварэння свят» пры падрыхтоўцы заняткаў:

1. Змест кожнага занятку і падрыхтоўка да яго павінны спрыяць выхаванню патрыятызму.

2. Усе арганізацыйныя пытанні па выбары і распрацоўцы свята павінны быць загадзя абмеркаваны паміж выкладчыкам і студэнтамі.

3. Дзейнасць студэнтаў у працэсе падрыхтоўкі і правядзення свята павінна быць усвядомленай. Толькі пры гэтай умове можна стварыць неабходныя матывы дзейнасці і, адпаведна, дасягнуць станоўчых вынікаў.

4. Вялікую ўвагу трэба надаваць зместу сцэнарыя свята, які будзе спрыяць выхаванню патрыятызму.

5. Неабходна добра прадумаць спалучэнне розных відаў мастацтва.

6. Святы павінны стымуляваць ініцыятыву і самастойнасць.

7. У працэсе падрыхтоўкі свята неабходна развіваць творчую актыўнасць студэнтаў, пазнавальныя працэсы.

8. Пасля распрацоўкі свята важна замацаваць атрыманыя веды. Для гэтага трэба праводзіць гутаркі, круглыя сталы, дыскусіі і інш. Мэтазгодна пры падвядзенні вынікаў заняткаў выкарыстоўваць рэфлексію.

---

1. *Гуд, П. А.* Тэхналогія стварэння свята : вучэб. дапам. / П. А. Гуд. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры, 2004. – 224 с.

2. *Наумчик, В. Н.* Воспитание трудных детей: Теория. Практика. Эксперимент : пособие для учителей, воспитателей, студентов, магистрантов, аспирантов пед. высш. учеб. заведений / В. Н. Наумчик, М. А. Паздников. – Минск : Адукацыя і выхаванне, 2013. – 472 с.